

# У адным рыт

Яны прадстаўляюць новае пакаленне беларускай сцэ
Арцём Скароль і Лера Бернатовіч увайшлі ў лік самых яр
у намінацыі "Найлепшы дуэт". За эфектнымі нумарам
пастаянныя пошукі натхнення і шчырае жаданн



7.30

## ПЕРШЫЯ АКОРДЫ

Пачатак дня ў артыстаў дуэта рэдка бывае размераным. Нават калі за акном — ціхая нядзеля, дзесьці ўжо чакае дарога, сцэна або рэпетыцыя.

Арцём Скароль расказвае:

— Калі няма канцэртаў, прачынаюся каля сямі і — ва ўніверсітэт. Звычайна зранку не снедаю. А вось калі напярэдадзе выступленне, рыхтуюся загадзя: касцюм прасую звечара, акуратна складаю ў чахол, збіраю заплечнік. Часам выязджаць даводзіцца яшчэ да світання — у чатыры або пяць. Таму стараюся легчы раней, каб аднавіць сілы.

У Леры Бернатовіч — іншы лад:

— Мой дзень заўсёды пачынаецца з доўгага прабуджэння. З-за шчыльнага графіка паўнавартаснага сну амаль няма — часам кладзёмся і ў гадзіну ночы, і ў тры. Таму мяне ратуе кубак гарбаты. Каву не п'ю, а вось чай — тое, што дапамагае настроіцца на працу.

Жыццё маладых артыстаў патрабуе строгай самаарганізацыі, але захоўваць ідэальны распарадак удаецца не заўжды.

— Стараемся берагчы здароўе, хоць у напружаным рытме гэта няпроста. Нават калі дзень распісаны па хвілінах, шукаем момант, каб перакусіць, перавесці дух. Без кароткіх паўзаў немагчыма трымаць форму — ні фізічную, ні творчую, — адзначае Валерыя.

16.00

## ГАРМОНІЯ СУПЯРЭЧНАСЦЕЙ

Тварыць у дуэце — значыць штодня шукаць баланс паміж рознымі тэмпераментамі, галасамі, поглядамі на музыку. Знешне ўсё здаецца простым: двое выходзяць на сцэну і гучаць, бы адзінае цэлае. Але за гэтай гармоніяй — карпатлівая ўнутраная праца, уменне саступаць, слухаць і разумець.

— Часам меркаванні адрозніваюцца, — гаворыць Арцём. — У кожнага сваё адчуванне песні, свой густ, свае акцэнты. Але ж заўсёды знаходзім агульнае рашэнне — або я прымаю погляд Леры, або яна мой. Галоўнае, каб вынік быў шчырым і жывым.

— Арцём — спакойны, засяроджаны, — дадае Лера. — Ён можа доўга думаць над кожнай нотаю, шукаць ідэальнае гуч
наадварот, імпульсіўн
трэбны рух, эмоцыі, к
непадобныя, але мена
дуэту дыханне. Калі ад
ў цішыню, другі прын
і энергію.

Розныя па характар
ідуць у адным тэмпе —
"рытме на дваіх", у як
ецца іх музыка.

— Навучыліся слуха
наго, — працягвае спя
ват калі спрачаемся, т
тыўна. Бывае, спрэчка
з дробязей — напрыкл
касцюмаў. Але ўсё вы
дыялогу. Галоўнае — н
емную павагу і пачуц
ства.





13.00

## У ТАКТ РАЗВІЦЦЮ

Маючы прыкметныя поспехі на сцэне, выканаўцы працягваюць вучыцца і спалучаюць заняткі з насычанымі гастролямі.

Арцём асвойвае мастацтва эстрады ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў:

— Адукацыя для мяне — не фармальнасць, — распавядае хлопец. — Гэта магчымасць расці, развівацца, разумець справу знутры. Часам дні нагадваюць марафон: раніцай лекцыі, потым праца ў студыі, увечары — выступленне. Вяртаешся дадому апоўначы, а ўжо назаўтра зноў у дарозе. Але адно падсілкоўвае другое: веды натхняюць на творчасць, а сцэна дае вопыт, якога не атрымаеш у аўдыторыі.

Лера навучаецца ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў і прызнаецца, што акадэмічная падрыхтоўка застаецца для яе апорай:

— У мяне чатыры заняткі па вакале на тыдзень, стараюся іх не прапускаць. Калі такое здараецца, пасля працую ўдвая больш — распеўкі, тэхніка, разбор твораў. Кожны ўрок — як маленькі канцэрт перад настаўнікам.

Рэпетыцыі дуэта займаюць асаблівае месца ў графіку.

— Нярэдка на пляцоўцы праводзім па 12 гадзін, — кажа Арцём. — Асабліва перад вялікімі канцэртамі. Гэта бясконцыя прагоны, карэкціроўкі, работа з гукам і са святлом. Удасканальваем усё да дробязей, бо публіка адчувае, калі артыст выкладваецца на поўную.



21.0

Н
вык
біст
ім н
гію
па-з

цём
ня "
і тэ
выл
баск
залу
з па
саб

# …тме на дваіх

…й сцэны — маладых, амбіцыйных і таленавітых. …ых яркіх удзельнікаў "Песні года Беларусі — 2024" …арамі — штодзённая вучоба, нястомная праца, …данне, каб песні гучалі ў сэрцах слухачоў.





## 19.00 ЗА КУЛІСАМІ — ЦІШЫНЯ

Выхад на сцэну для маладых артыстаў — асаблівы момант, калі ўсё лішняе застаецца за кулісамі. Кожнае выступленне — як маленькае адкрыццё: варта не толькі спяваць, але і перадаваць настрой, унутраную праўду.

— Я вернік, — кажа Арцём. — Калі асабліва хвалююся, малюся. Гэта дапамагае сабрацца, адчуць упэўненасць і з'явіцца на сцэне спакойным, засяроджаным.

— А ў мяне іншы спосаб, — адзначае Лера. — Мне патрэбныя 5—10 хвілін цішыні. Проста заплюшчыць вочы, удыхнуць, выдыхнуць — і адчуць момант. Тады хваляванне знікае, застаецца толькі радасць сустрэчы з гледачом.

У кожнага з нашых герояў свой шлях да сцэны, але мэта агульная — увайсці ў той стан, калі музыка — працяг дыхання. У гэтае імгненне дуэт ператвараецца ў адзінае цэлае — упэўненае і натхнёнае.

## …ЦЕЙ

…нае гучанне. А я, …ульсіўная, мне па…оцыі, кантакт. Мы …е менавіта гэта дае … Калі адзін пагружае …і прыносіць святло

…рактары, яны ўсё ж …эмпе — тым самым …к", у якім нараджа…

…я слухаць адзін ад…вае спявачка. — На…емся, то канструк…прэчка пачынаецца …апрыклад, з выбару … усё вырашаецца ў …ае — не згубіць уза… пачуццё партнёр…



## 23.00 ШЛЯХАМ УДЗЯЧНАСЦІ

Вечар — момант спыніцца, перагарнуць старонкі пражытага і зазірнуць наперад.

Перамога ў намінацыі "Найлепшы дуэт" на конкурсе "Песня года Беларусі — 2024" стала важнай вяхой — першым сур'ёзным дасягненнем творчага тандэма.

— Для нас гэта вялікі гонар, — з удзячнасцю падкрэслівае Арцём. — Гэта першая сапраўды значная ўзнагарода. Яе нам падарылі беларусы — што асабліва каштоўна.

— Шчыра рады, бо і журы, і гледачы адчулі тое, што мы ўкладваем у кожную песню, — распавядае Лера. — Наш дуэт існуе ўсяго два гады, але такі вынік сведчыць: мы на правільным шляху. Гэта натхняе і дае сілы рухацца далей.

Пра будучыню артысты гавораць упэўнена, без гучных дэкларацый.

— Хочацца, каб нашу музыку пачула як мага больш людзей, каб яна сапраўды кранала, — дзеліцца марамі юнак.

— Галоўнае — не спыняцца, — працягвае дзяўчына. — Расці, эксперыментаваць, адкрываць новыя фарбы, але заўсёды заставацца шчырымі са слухачом. Бо музыка павінна злучаць — не толькі нас, але і тых, хто побач.

Здаецца, менавіта ў гэтым і ёсць сакрэт дуэта: два розныя тэмпераменты, два погляды на свет з агульнай інтанацыяй — інтанацыяй жывога пачуцця, што гучыць у кожным акордзе.

**Ганна КАЛІНІНА**
Фота з архіва дуэта




## 21.00 ПЕРАПЫНАК ЯК КРЫНІЦА

Нягледзячы на шчыльны графік, выканаўцы стараюцца захоўваць асабістую прастору — тое, што дапамагае ім не губляць сябе, аднаўляць энергію і знаходзіць крыніцы натхнення па-за эстрадай.

— Пішу музыку, — расказвае Арцём. — У жніўні выйшла наша песня "Між намі", для якой я стварыў і тэкст, і мелодыю. Часам удаецца вылучыць хвіліну для спорту: люблю баскетбол, наведваю трэнажорную залу. А летам атрымалася выбрацца з палаткамі на возера — выдатны спосаб адключыцца ад мітусні, пабыць на свежым паветры і паглыбіцца ў шчырыя размовы.

У Леры — свой рэцэпт перазагрузкі:

— Адпачываю ў цішыні — у свеце фантазіі. Вельмі люблю чытаць, пераважна папяровыя кнігі, для мяне мае значэнне нават пах старонак. Электронныя версіі — ужо не тое. Яшчэ абажаю маляваць: часам проста на занятках раблю накіды ў сшытку. Гэта супакойвае і дапамагае сабраць думкі.

Такія кароткія перапынкі вяртаюць Арцёму і Леры сілы — разам з новымі пачуццямі, ідэямі і песнямі.